Created in Master PDF Editor - Demo Version

# ВЕСТНИК МГИРО

*Научно-методический журнал*
*Издается ежеквартально*
*Издается с сентября 2010 года*

**№ 1(33)**
**январь-март 2018 г.**

**MCIDE NEWSTELLER**
*Scientific-methodical magazine*
*Is Published quarterly*
*Since September 2010*

В соответствии с приказом
Председателя Высшей аттестационной комиссии
Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 94
(в редакции приказа от 13 января 2017 г. № 6)
журнал включен в Перечень научных изданий
Республики Беларусь для опубликования
результатов диссертационных исследований
по историческим, педагогическим
и психологическим наукам

Зарегистрирован
Министерством информации Республики Беларусь
в Государственном реестре средств массовой
информации за № 1090 09.12.2010 г.

**Главный редактор** Татьяна Ивановна Мороз
**Ответственный за выпуск** Н. Н. Пинчук
**Редактор** И. Л. Бондарь
**Верстка** Н. Н. Пинчук
**Дизайн обложки** П. И. Цихович

Подписано в печать 12.03.2018.
Выход в свет 26.03.2018.
Формат 60x84/8. Бумага офсетная.
Гарнитура Cambria. Ризография.
Усл.печ. л. 11,6. Уч.-изд. л. 11. Тираж 160.
Заказ 252. Цена свободная.

Издатель и полиграфическое
исполнение ГУО «Минский городской
институт развития образования»
Свидетельство № 1/176 от 12.02.2014.

ЛП № 02330/460 от 03.03.2014.
Адрес редакции: 220034, г. Минск,
пер. Броневой, 15а, тел. 294-85-51
e-mail: mgiro@minsk.edu.by
Адрес типографии: 220034,
г. Минск, пер. Броневой, 15а.

Статьи в рубрику «Научные публикации» рецензируются. Полное или частичное воспроизведение или размножение любым способом материалов, опубликованных в настоящем издании, допускается только с письменного разрешения издателя. Материалы в рубрику «Образовательная практика» не рецензируются и не возвращаются.

*Редакционная коллегия*

**Т. И. Мороз,** кандидат педагогических наук, доцент;

**С. П. Стренковский,** доктор исторических наук, профессор, заместитель главного редактора;

**Л. Н. Воронецкая,** кандидат педагогических наук, доцент;

**Н. Л. Кузьминич,** кандидат педагогических наук, доцент;

**А. М. Лютый,** доктор исторических наук, профессор;

**В. Н. Наумчик,** доктор педагогических наук, профессор;

**Л. В. Орлова**, кандидат психологических наук, доцент;

**Б. В. Пальчевский,** доктор педагогических наук, профессор;

**Л. А. Пергаменщик,** доктор психологических наук, профессор;

**Т. О. Пучковская**, кандидат педагогических наук, доцент;

**С. В. Снапковская,** доктор исторических наук, доктор педагогических наук, профессор;

**О. М. Старикова,** кандидат педагогических наук, доцент;

**О. В. Толкачева,** кандидат педагогических наук, доцент;

**В. В. Чечет,** доктор педагогических наук, профессор;

**В. А. Янчук,** доктор психологических наук, профессор;

**Л. Г. Венцерева**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

УДК 94 (476) : 338.45”18/19” 

***П. А. Мацюш***

# РОЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў ФАРМІРАВАННІ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

У артыкуле асвятляюцца пытанні фарміравання грамадства новага тыпу ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Даследчык абапіраецца на сучасныя работы ў галіне сацыяльна-эканамічнай гісторыі, распрацаваную тэорыю індустрыяльнага грамадства. Аўтары гэтай тэорыі (Ж. Фурасцье, Р. Арон і інш.) звязвалі працэс фарміравання грамадства новага тыпу з распаўсюджваннем буйной машыннай вытворчасці, урбанізацыяй, панаваннем рынкавай эканомікі, узнікненнем сацыяльных груп прадпрымальнікаў і наёмных рабочых, станаўленнем дэмакратыі, грамадзянскай прававой дзяржавы. Аўтарам вылучаюцца асноўныя рысы індустрыяльнага грамадства; аналізуецца ўзровень развіцця і спецыфіка прамысловай вытворчасці ў Беларусі ў названы перыяд; падкрэсліваецца роля прамысловасці ў станаўленні індустрыяльнай мадэлі грамадскага развіцця; раскрываюцца асноўныя фактары, што паўплывалі на працэс сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі ў паўночна-заходнім рэгіёне Расійскай імперыі

**Ключавыя словы:** індустрыяльнае грамадства, капіталізм, мадэрнізацыя, прамысловасць, спецыялізацыя, традыцыйнае грамадства, фабрычная вытворчасць, урбанізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

***Уводзіны.*** Фарміраванне індустрыяльнага грамадства – працэс, які актыўна разгарнуўся ў Беларусі ў другой палове XIX ст. Ён меў аб’ектыўныя падставы і быў выкліканы разнастайнымі фактарамі. На думку аўтара выключна важная роля ў гэтым працэсе належала прамысловасці. Яе імклівае развіццё забяспечыла пераход да новай індустрыяльнай эканомікі, садзейнічала сацыяльнай трансфармацыі і зменам у духоўна-культурным жыцці.

Адным з першых аналіз індустрыяльнай эвалюцыі Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст. зрабіў У.І. Ленін у працы «Развіццё капіталізму ў Расіі» [1]. Аўтар падрабязна разгледзеў стан прамысловасці Расіі у сувязі з пераходам краіны да капіталістычнай сістэмы гаспадарання.

Вывучэнне пытанняў індустрыяльнага развіцця Расійскай імперыі займала важнае месца ў савецкай даваеннай і пасляваеннай гістарыяграфіі, якая грунтавалася на фармацыйным падыходзе. Праблемы генезісу капіталізму, зараджэння буржуазных адносін, прамысловага перавароту



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

шырока вывучаліся ў савецкі перыяд В.І. Бабыкіным [2], А.М. Панкратавай [3], К.А. Пажытновым [4], С.Г. Струміліным [5] і інш.

Пытанні прамысловага развіцця Беларусі, станаўлення буржуазных адносін, фарміравання пралетарыяту ў парэформены перыяд даследавалі беларускія гісторыкі М.В. Біч [6], М.Ф. Болбас [7], З.Я. Абезгаўз [8], А.М. Люты [9], В.П. Панюціч [10] і інш. У меншай ступені вывучаны пытанні нацыянальнага адраджэння, функцыянавання саслоўных інстытутаў, змяненняў у менталітэце людзей, станаўлення элементаў грамадзянскай супольнасці, ўзаемасувязі этнакультурных і палітычных кампанентаў менавіта ў кантэксце фарміравання індустрыяльнага грамадства.

У 90-я гг. XX ст. многія даследчыкі адмовіліся ад фармацыйнага падыходу і ў пошуках новых метадалагічных падыходаў і тэорый пачалі абапірацца на іншыя канцэпцыі. У сучасных даследаваннях сацыяльна-эканамічнай гісторыі выкарыстоўваецца тэорыя індустрыяльнага грамадства, што актыўна развівалася заходнімі сацыёлагамі, эканамістамі, філосафамі, гісторыкамі XIX–XX ст.

Так, першую канцэпцыю індустрыяльнага грамадства вылучыў французскі вучоны Ж. Фурасцье. Тэрмін «традыцыйнае грамадства» быў запазычаны ім у нямецкага сацыёлага М. Вебера, тэрмін «індустрыяльнае грамадства» – у А. Сен-Сімона.

Канцэпцыю індустрыяльнага грамадства актыўна развіваў Р. Арон. Ён, як і Ж. Фурасцье адзначаў, што для традыцыйнага (аграрнага) грамадства характэрна дамінаванне земляробства і жывёлагадоўлі, натуральнай гаспадаркі, існаванне саслоўяў, аўтарытарны спосаб кіравання, для індустрыяльнага (рацыянальнага) – панаванне буйной прамысловай вытворчасці, развіццё рынкавых адносін, усталяванне грамадзянскіх правоў і свабод і інш. [11].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Расійскі даследчык Т.С. Паніётава вылучыла наступныя сацыяльна-эканамічныя і духоўна-культурныя наступствы працэсу індустрыяльнай мадэрнізацыі:

- замена фабрыкай мануфактуры, што прывяло да нябачанага раней росту прадукцыйнасці грамадскай працы;
- развіццё вытворчасці садзейнічала ўрбанізацыі, росту гарадоў як прамысловых і культурных цэнтраў;
- укараненне ў вытворчасць машын і механізмаў прывяло да скарачэння працоўных месцаў, але дэмаграфічны выбух і ўдасканаленне транспартнай інфраструктуры выклікалі рост мабільнасці насельніцтва;
- змены ў сацыяльнай структуры індустрыяльнага грамадства (сфарміраваліся буржуазія, прамысловы пралетарыят і так званае новае дваранства);
- павышэнне ролі дзяржавы як важнейшага нацыястваральнага і гаспадарчага фактара;
- стварэнне спецыфічнай сістэмы каштоўнасцей, якая ўключала індывідуалізм, карысць, дастатак, камфорт і спажывецтва, дзелавую актыўнасць і працавітасць [12, с. 24–25].

Нягледзячы на розныя падыходы даследчыкаў, што выразна акрэсліліся больш чым за стогадовы перыяд, агульным для ўсіх з'яўляецца вызначэнне індустрыяльнай рэвалюцыі як галоўнага фактара эканамічных, сацыцяльных, палітычных, культурных пераўтварэнняў.

Мэта артыкула – раскрыць ролю прамысловасці ў фарміраванні індустрыяльнага грамадства ў Беларусі ў акрэслены перыяд.

***Асноўная частка.*** Мадэрнізацыйныя працэсы на беларускіх землях паскорыліся пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. і ў сувязі з буржуазнымі рэформамі 60-х гг. XIX ст. Такім чынам, акрамя самадзяржаўных метадаў кіравання эканомікай, сацыяльнымі і грамадска-палітычнымі працэсамі былі выкарыстаны і пэўныя ліберальныя падыходы [13, с. 171].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

У разгортванні мадэрнізацыйных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. было шэраг асаблівасцей. Па-першае, у адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, дзе авангардам мадэрнізацыі былі гарады і там канцэнтравалася прамысловасць, у Беларусі значная частка прадпрыемстваў размяшчалася ў сельскай мясцовасці. Па-другое, рухавіком мадэрнізацыі тут шмат у чым было дваранства, якому належала значная колькасць прамысловых прадпрыемстваў, правы сацыяльна-эканамічнай ініцыятывы [14, с. 43–44].

Рух Беларусі, як і ў цэлым Расійскай імперыі, па індустрыяльнаму шляху хоць і паўтараў у асноўным індустрыяльнае развіццё еўрапейскіх краін, але адрозніваўся запозненасцю эканамічных, сацыяльных і грамадскіх працэсаў.

Тэхнічны бок прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі характарызавалася пачаткам паступовага пераходу ад цэхавай арганізацыі, ліквідаванай у 1852 годзе ў гарадах і мястэчках у сувязі з невялікай колькасцю рамеснікаў, да мануфактурнай, заснаванай на ручной вытворчасці з падзелам (спецыялізацыяй) працы, і фабрычна-заводскай стадыі развіцця прамысловасці.

У 1860 г. у Беларусі налічвалася 76 фабрык і заводаў, 140 мануфактур і каля 28 тыс. дробных прадпрыемстваў. Да 1900 г. доля фабрычна-заводскай вытворчасці ў агульным аб’ёме прамысловай прадукцыі складала амаль палову.

У другой палове XIX ст. у Беларусі заставаўся нізкім паказчык узроўню канцэнтрацыі вытворчасці. Прадпрыемствы з колькасцю рабочых да 50 чалавек складалі абсалютную большасць усіх прамысловых прадпрыемстваў. У 1900 г. на адно прадпрыемства ў сярэднім прыходзілася 39 рабочых. У 1860 г. дробнакапіталістычныя прадпрыемствы (тыя, дзе працавалі 5 – 15 чалавек, без паравога рухавіка) давалі больш за палову, а ў канцы XIX стагоддзя – крыху больш за 30% ад усёй выразбленай прамысловай прадукцыі [15].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Варта ўлічваць і фактар рэгіяналізацыі прамысловасці. Першае месца па ўзроўні прамысловага развіцця займала Гродзенская губернія. У ёй была засяроджана амаль трэцяя частка ад агульнай колькасці фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, якія меліся на беларускіх землях, 36% усіх рабочых. Тут выраблялася 41% ад усёй прадукцыі, што давала Беларусь [13, с. 174]. Але з пункту гледжання інтэнсіўнасці развіцця прамысловасці і рынкавых адносін патэнцыйныя магчымасці розных рэгіёнаў Беларусі былі прыкладна аднолькавыя, паколькі слабыя ў эканамічным дачыненні раёны суседнічалі з моцнымі і размяшчаліся як у заходняй, так і ва ўсходняй яе частках [16, с.171].

Пад уплывам агульнарасійскага і еўрапейскага рынкаў, які па меры будаўніцтва чыгунак няўхільна ўзрастаў, у 1860–1880-я гг. канчаткова вызначылася спецыялізацыя беларускай прамысловасці, арыентаваная на перапрацоўку мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны. Прамысловасць пераважна размяшчалася ў сельскай мясцовасці – бліжэй да крыніц сыравіны і таннай рабочай сілы. У 1900 г. 45,4% усіх рабочых працавалі ў мястэчках і маёнтках. Найбольшае развіццё атрымалі тут вінакурэнне і дрэваапрацоўка.

Хуткаму развіццю капіталістычнай гаспадаркі, станаўленню таварна-грашовых адносін спрыяла паляпшэнне шляхоў зносін і сродкаў сувязі. Стварэнне індустрыяльнага сектара ў эканоміцы патрабавала ўдасканалення інфраструктуры і развіцця транспартных камунікацый. Чыгуначны рух садзейнічаў уздыму гарадоў і мястэчак, пра якія раней было мала што вядома. Увогуле буйнамаштабнае чынугачнае будаўніцтва ў другой палове XIX ст. стала найважнейшым фактарам, які фарсіраваў прамысловы пераварот і працэс фарміравання індустрыяльнага грамадства [17, с. 269]. У канцы XIX ст. у разліку на 100 км. кв. у Беларусі мелася шашэйных дарог у два разы, а рачных – у тры разы больш, чым у еўрапейскай частцы Расіі. У найбольшай ступені для патрэб буржуазнага развіцця было прыстасавана чыгуначнае будаўніцтва. Праз тэрыторыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Беларусі прайшлі важнейшыя магістралі: Маскоўска-Брэсцкая, Лібава-Роменская, Рыга-Арлоўская. Дзякуючы ім значна ўмацаваліся сувязі беларускага рынку з агульнарасійскім і еўрапейскім [15].

Пераход да індустрыяльнага грамадства варта разглядаць не толькі ў рэчышчы станаўлення і развіцця фабрычнай вытворчасці, але і як працэс сацыяльнай трансфармацыі. Вынікамі гэтай трансфармацыі сталі: скарачэнне долі насельніцтва занятага ў сельскай гаспадарцы, развіццё адукацыі, навукі, прымяненне яе дасягненняў ва ўсіх сферах жыцця, асабліва ў індустрыяльнай вытворчасці.

Прынцыпова новай рысай беларускага грамадства другой паловы XIX ст. стала фарміраванне класа наёмных рабочых. Адмена прыгоннага права значна пашырыла сацыяльную базу для фарміравання пралетарыяту за кошт былога прыгоннага сялянства. Сярод рабочых гарадской прамысловасці Беларусі ўдзельная вага выхадцаў з мяшчан была значна вышэй, а сялян – ніжэй, чым у цэнтральнай Расіі і ў цэлым па Расійскай імперыі. Гэта тлумачылася палітыкай штучнай урбанізацыі яўрэйскага насельніцтва ў заходніх губернях, якую праводзіў царызм. У выніку паводле перапісу 1897 г. яўрэі сярод мяшчан беларускіх гарадоў складалі 77,1%, а ў паветах 62,7%.

У цэлым удзел у фарміраванні беларускага пралетарыяту прымалі ўсе саслоўі, не выключаючы дваран і іншаземцаў. З цягам часу сярод рабочых усё часцей сустракаліся выхадцы з рабочых сем'яў, патомныя пралетарыі. Выхадцы з сем'яў рабочых ва ўсіх галінах вытворчасці, улічаныя перапісам 1897 г., складалі каля 20% прамысловага пралетарыяту Беларусі. Нацыянальны склад рабочых мяняўся ў залежнасці ад галіны прамысловасці, таго месца, дзе было размешчана прадпрыемства і нацыянальнасці жыхароў. У буйных гарадах адносна больш было яўрэйскіх, польскіх і рускіх рабочых. У сельскай мясцовасці пераважалі пралетарыі-беларусы. На рубяжы XIX–XX ст. у прамысловасці Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

працавала 237 тыс. рабочых. Агульная колькасць пастаянных наёмных рабочых у той час перавышала 460 тыс. [18, с. 211].

Найбольш паказальным сведчаннем развіцця індустрыяльнага грамадства з’яўлялася ўрбанізацыя. Крыніцай павелічэння колькасці гандлёва-прамысловага насельніцтва стала сялянства. Працэс урбанізацыі знаходзіў сваё адлюстраванне ў росце гарадскіх паселішчаў, канцэнтрацыі насельніцтва ў іх і асабліва ў буйных гарадах, у распаўсюджанні рыс гарадскога жыцця. Усяго ў Беларусі перад пачаткам Першай сусветнай вайны налічвалася 45 гарадоў [18, с. 367].

На працягу XIX ст. у Беларусі актыўна фарміруецца новая сацыяльная група – прадпрымальнікі. Іх можна было аб’яднаць не саслоўным паходжаннем або маёмасным становішчам, а здольнасцю весці справу па законах рынкавай эканомікі. Асноўнымі крыніцамі іх колькаснага росту ў Беларусі сталі прадстаўнікі дваранскага і купецкага саслоўяў, у меншай ступені – выхадцы з мяшчан і сялянства. Менавіта ў прадпрымальніцкай дзейнасці найбольш поўна выявіліся мясцовыя, тыповыя для Беларусі, эканамічныя асаблівасці. Прадпрымальнікі валодалі глыбокімі ведамі вытворчых тэхналогій і тэхнікі, з’яўляліся таленавітымі арганізатарамі капіталістычнай вытворчасці. Яны праводзілі эфектыўную сацыяльную палітыку на сваіх прадпрыемствах, прымалі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці. Пры фармаванні гэтай сацыяльнай катэгорыі выразна выявілася грамадская роля рынкавай эканомікі. Напрыклад, для ўваходжання ў гэтую групу не было перашкодаў саслоўнага ці этна-канфесійнага характару. Валоданне капіталам і занятак прадпрымальніцтвам ламалі саслоўныя рамкі Расійскай імперыі. Для прадпрымальнікаў дасягненне эканамічных свабод азначала і пераадоленне абмежаванняў саслоўна-феадальнай сістэмы самадзяржаўя [19, с. 111–112].

Нягледзячы на тое, што большасць прадпрыемстваў у названы перыяд па-ранейшаму належала дваранам, купецкае прадпрымальніцтва



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

пачынала адыгрываць больш прыкметную ролю ў сацыяльнай структуры беларускага грамадства.

Важным паказчыкам развіцця прамысловасці з'яўляўся гандаль. У разглядаемы перыяд адчыняліся гандлёвыя дамы, якія спалучалі вытворчую і гандлёвую дзейнасць. 27% з іх былі заняты ў дрэваапрацоўцы, 25% – у хімічнай, 22% – у харчовай прамысловасці. Былі таксама прадстаўлены цагляна-сілікатная, гарбарная, металургічная галіны прамысловасці [20, с. 80–81].

***Заключэнне.*** Такім чынам, развіццё прамысловасці ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. мела выразныя асаблівасці, што адклала адбітак на працэс фарміравання індустрыяльнга грамадства. Сярод іх можна вылучыць наступныя:

- развіццё фабрычна-заводскай прамысловасці ішло вельмі павольна і адставала ад заходнееўрапейскіх і агульнарасійскіх тэмпаў;
- працэс першапачатковага назапашвання капіталу ў Беларусі зацягнуўся, што стрымлівала хуткае развіццё буйной прамысловасці;
- захаванне значнай долі дробнай прамысловасці, якая давала больш паловы валавой прадукцыі, нягледзячы на развіццё фабрык і заводаў;
- спецыялізацыя прамысловасці на перапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі, мясцовай лясной і мінеральнай сыравіны;
- прамысловае развіццё стрымлівалася канкурэнцыяй з боку расійскай і польскай прамысловасці, якія мелі перавагу.

Разам з тым, фабрычна-заводская прамысловасць паступова займала галоўнае месца ў прамысловым сектары беларускай эканомікі, з'яўляючыся важным паказчыкам тэхнічнага прагрэсу для Беларусі.

У сацыяльным плане пераход да індустрыяльнага грамадства азначаў колькасны рост прамысловай буржуазіі, фабрычнага пралетарыяту. Фарміраванне класа наёмных рабочых стала новай рысай беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Адмена прыгоннага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

права значна пашырыла сацыяльную базу для фарміравання пралетарыяту за кошт былога прыгоннага сялянства.

З'явілася новая сацыяльная група – прадпрымальнікі, аб'яднаныя не саслоўным паходжаннем або маёмасным становішчам, а здольнасцю весці справу па законах рынкавай эканомікі.

Такім чынам, індустрыяльнае грамадства для свайго функцыянавання патрабавала сучаснай эканомікі, адпаведнай сацыяльнай структуры, адэкватнай сістэмы каштоўнасных арыентацый, скіраваных на індывідуалізм, прадпрымальніцтва, грамадзянскую актыўнасць.

**Спіс літаратуры:**

1. Ленин, В. И. Развитие капитализма в России : Процесс образования внутреннего рынка для крупной промышленности / В. И. Ленин. – Ленинград ; Москва : Гос. изд-во, 1925. – 531 с.

2. Бовыкин, В. И. Индустриальное развитие России до 1917 г. / В. И. Бовыкин. – Москва : Наука, 1970. – 14 с.

3. Панкратова, А. М. О роли товарного производства при переходе от феодализма к капитализму / А. М. Панкратова // Вопросы истории. – 1953. – № 9. – С. 59–77.

4. Пажитнов, К. А. К вопросу о «переломе» в мануфактурной промышленности XVIII века / К. А. Пажитнов // Вопросы истории. – 1948. – № 3. – С. 60–64.

5. Струмилин, С. Г. Очерки экономической истории России / С. Г. Струмилин. – Москва : Изд-во соц.-эконом. лит-ры, 1960. – 547 с.

6. Біч, М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / М. В. Біч // Вес. АН БССР. Сер. грам. нав. – 1972. – № 4. – С. 32–39.

7. Болбас, М. Ф. Промышленность Белоруссии 1860 – 1900 гг. / М. Ф. Болбас, Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

8. Абезгауз, З. Е. Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З. Е. Абезгауз. – Минск : Наука и техника, 1971. – 179 с.

9. Панютич, В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии, 1861–1914 гг. / В. П. Панютич. – Минск : Наука и техника, 1969. – 190 с.

10. Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX / А. М. Лютый. – Минск : Наука и техника, 1987. – 181 с.

11. Концепции индустриального общества. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://storyo.ru/filo/17_03.htm. – Дата доступа : 28.01.2018.

12. Паниотова, Т. С. Культурная история Запада в контексте модернизации: (XIX – начало XXI в.) : монография / Т. С. Паниотова. – М. – Берлин : Директ-Медиа, 2014 – 223 с.

13. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1. / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.

14. Кохановский, А. Г. На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.) / А. Г. Кохановский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2008. – С. 31–46.

15. Промышленная революция в Беларуси XIX века. На пути к индустриальному обществу. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://allby.tv/article/1522/promyishlennaya-revolyutsiya-v-belarusi-xix-veka-na-puti-k-industrialnomu-obschestvu. – Дата доступа : 29.01.2018.

16. Терешкович, П. В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. – Минск : БГУ, 2004. – 223 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

17. Соловьева, А. М. Промышленная революция в России в XIX в. / А. М. Соловьева. – Москва : Наука, 1990. – 272 с.

18. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т.4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш. ; Рэдкал. : М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с.

19. Киштымов, А. Вопросы экономического развития Беларуси и белорусская национальная идея в начале XX в. / А. Киштымов. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://pdf.kamunikat.org/2181-6.pdf. – Дата доступа : 14.09.2017.

20. Полетаева, Н. И. Купечество в торговых домах Беларуси (конец 19 – начало 20 в.) / Н. И. Полетаева // Весн. Беларус. дзярж. экан. ун-та. – 2002. – N 6. – С. 76–81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**SUMMARY**

The issues of formation of a new type society in Belarus in the second half of XIX – early XX century are highlighted in the article. The researcher is based on modern works in the field of social and economic history, developed theory of industrial society. Authors of the theory (J. Fourastie, R. Aron, and others) connected the process of new type society formation with distribution of large machine production, urbanization, the dominance of market economy, the emergence of social groups of entrepreneurs and hired workers, the establishment of democracy, civil law. The author points out the main features of industrial society; analyzes the level of development and the specificity of industrial production in Belarus within the specified period; emphasized the role of the industry in the formation of the industrial model of social development; revealed the main factors that influenced the process of social and economic modernization in the northwest region of the Russian Empire

**Key words:** industrial society, capitalism, modernization, industry specialization, traditional society, factory production, urbanization

*Артыкул здадзены ў друк 01.02.2018*



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

ЗВЕСТКІ АБ АЎТАРЫ

**Прозвішча, імя, імя па бацьку:** Мацюш Павел Аркадзьевіч.

**Пасада:** загадчык навукова-даследчым сектарам УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

**Праца па сумяшчальніцтве:** дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

**Вучоная ступень:** кандыдат гістарычных навук.

**Вучонае званне:** дацэнт.

**Працоўны тэлефон:** +375 17 226-40-15.

**Мабільны тэлефон:** +375 44 567-88-72.

**E-mail:** Greatpaulius@yandex.ru

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version